# Краіны Цэнтральнай Амерыкі. Мексіка

**Л. М. Берасцень,**
намеснік дырэктара па ВВР, настаўнік геаграфіі
Бярозавіцкай сярэдняй школы Пінскага раёна

**Мэта:** плануецца, што навучэнцы **будуць ведаць** дэмаграфічныя асаблівасці Мексікі, спецыялізацыю гаспадаркі краіны; **умець** характарызаваць асаблівасці насельніцтва; **апісваць** асаблівасці эканомікі краіны; **паказваць** на карце буйнейшыя эканамічныя цэнтры

**Задачы:**

– замацоўваць навыкі самастойнай работы з рознымі крыніцамі інфармацыі;

– развіваць у навучэнцаў цікавасць да гісторыі, культуры, традыцый народаў краін свету;

– развіваць камунікатыўныя здольнасці, культуру працы.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік для 8 класа, палітычная карта свету, атлас “Краіны і народы”, контурная карта, раздатачны матэрыял, прэзентацыя.

**Тып урока**: вывучэнне новага матэрыялу.

**Формы работы**: індывідуальная, франтальная, парная, групавая

**Ход урока**

Той, хто жыве, бачыць шмат.
Той, хто падарожнічае, бачыць
больш. *Арабская прыказка*

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

Добры дзень! Мы працягваем з вамі падарожжа па краінах свету. І сёння адпраўляемся ў Цэнтральную Амерыку.

Давайце ўспомнім і пакажам на карце рэгіёны, якія ўваходзяць у склад Лацінскай Амерыкі. Назавіце і пакажыце краіны, якія ўваходзяць у рэгіён Цэнтральная Амерыка *( работа з картай).*

Сёння я прынесла на ўрок прадметы-сувеніры, якія з’яўляюцца візітнай карткай адной з краін Лацінскай Амерыкі (*кактус, самбрэра, перац чылі).* Калі ласка, скажыце, з якой краіны гэтыя рэчы? *(з Мексікі)*

Сёння з вамі мы адпраўляемся ў падарожжа па краіне Мексіка.

*Вучні запісваюць тэму ўрока ў сшытак.*

У кожнага навучэнца на парце памятка “План характарыстыкі краіны”.

1. ЭГС краіны, прыродныя ўмовы і рэсурсы.
2. Насельніцтва.

3. Гаспадарка (структура гаспадаркі, прамысловасць, сельская гаспадарка).
4. Транспарт.
5. Гандаль.Знешнеэканамічныя сувязі.
6. Помнікі архітэктуры і культурныя каштоўнасці



У любое падарожжа чалавек адпраўляецца з пэўнай мэтай. Давайце і мы паставім перад сабою мэту сённяшняга нашага падарожжа па краіне Мексіка

*Сумесная работа настаўніка і вучняў па вызначэнні мэты ўрока*

**II. Вывучэнне новага матэрыялу**

Мексіка – краіна з багатай гісторыяй, гарачым кліматам і ўнікальнай культурай, якая нарадзілася на стыку індзейскіх і еўрапейскіх шматвекавых традыцый.

А пачынаем сваё знаёмства з краінай з візітнай карткі

**Візітная картка краіны** *(Індывідуальная работа з падручнікам і атласам)*

Поўная назва краіны: *Мексіканскія Злучаныя Штаты*

Сталіца– *Мехіка*

Плошча –*1964,4 тыс.км*$^2$

Насельніцтва – *130,8 млн чал.*



Форма кіравання: *прэзідэнтская рэспубліка*

Палітыка-тэрытарыяльнае ўладкаванне – *федэрацыя (31 штат і 1 федэральная акруга)*

**Настаўнік.** Мексіканскія штаты прайшлі доўгі шлях фарміравання ў

асобную дзяржаву. За гэты час у краіне адбываліся розныя значныя падзеі, якія знайшлі сваё адлюстраванне на дзяржаўнай сімволіцы. У розныя гады сцяг і герб Мексікі адлюстроўваліся зусім па-рознаму. Нешта сышло ў далёкае мінулае, а нешта засталося нязменным. Вось так выглядае сучасная сімволіка Мексікі. Чаму менавіта такія карціны былі выбраны ў якасці адметных сімвалаў краіны?

***Паведамленне вучняў*** *( апераджальнае заданне для пары вучняў)*

Герб змяшчае выяву рэальных прадстаўнікоў мексіканскай флоры і фаўны, а менавіта: цэнтральная фігура мексіканскага герба – драпежная птушка – звычайная каракара, атрутная змяя, кактус напаль з цёмна-чырвонымі пладамі (тунамі), лаўр, галінка дуба.

Паводле старажытнаіндзейскага падання, бог сонца Уіцылапочтлі загадаў ацтэкам пасяліцца ў тым месцы, дзе ім сустрэнецца арол, які сядзіць на высокім кактусе і ўтрымлівае ў дзюбе змяю. Індзейцам удалося выявіць такую мясцовасць, якая поўнасцю адпавядала апісанню, і яны вырашылі заснаваць на заходнім беразе возера Тэскока, у маляўнічай даліне, свой горад. Гэтая легенда знайшла сваё адлюстраванне на сцягу і гербе Мексікі.

Мексіканскі сцяг прыняты 16 верасня 1968 года і мае палосы трох колераў, кожны з якіх нясе ў сабе сэнсавую нагрузку. Цікава, што з 1821 года колеры на сцягу заставаліся нязменнымі, а вось іх інтэрпрэтацыя мянялася.

Сучаснае тлумачэнне каляровых знакаў гучыць так: зялёны – надзея, а таксама ўрадлівыя мексіканскія землі, белы – чысціня і высакароднасць народа, чырвоны – кроў, якая пралілася за тое, каб Мексіканскія штаты здабылі сваю волю.

**Настаўнік**. Для далейшага знаёмства з краінай я прапаную работу ў групах. Кожная група атрымлівае картку з заданнем. На працу адводзіцца 8 хвілін.

*Настаўнік сочыць за працай кожнай групы. Калі ў час працы групы ўзнікаюць пытанні, вучні падымаюць картку жоўтага колеру. Калі група справілася з заданнем – падымаюць картку зялёнага колеру.*

***Картка для групы №1.*** <u>ЭГС краіны, прыродныя ўмовы і рэсурсы</u>

Выкарыстоўваючы тэкст падручніка (с.211), карты атласа (с.84), даць характарыстыку ЭГС Мексікі, прыродным умовам і рэсурсам.

1. У якім рэгіёне знаходзіцца Мексіка?
2. Якімі прыроднымі аб’ектамі абмежавана тэрыторыя краіны?
3. Назваць і паказаць на карце дзяржавы-суседзі.
4. Ахарактырызаваць прыродныя ўмовы.
5. Якімі карыснымі выкапнямі багата краіна?
6. Зрабіць вывад аб эканоміка-геаграфічным становішчы Мексікі.
7. Падрыхтуйце выступленне.

На контурнай карце (с. 40) нанесці краіны-суседзі Мексікі, водныя аб’екты, якія амываюць берагі краіны.

***Картка для групы №2.*** <u>Насельніцтва. Дэмаграфічныя асаблівасці.</u>

Выкарыстоўваючы тэкст падручніка (с.211-212) і карты атласа (с. 89), ахарактарызаваць дэмаграфічныя асаблівасці насельніцтва.

1. Вызначыць колькасць насельніцтва краіны.
2. Чаму Мексіка з’яўляецца адной з самых “маладых” краін свету?
3. Да якой расы належыць карэннае насельніцтва?
4. Якая змешаная этнічная група пераважае ў складзе навельніцтва?
5. Чаму сярод вернікаў большасць жыхароў краіны – каталікі?
6. Вызначыць узровень урбанізацыі.
7. Мексіка характарызуецца актыўнай эміграцыяй насельніцтва. Куды
8. эмігрыруе насельніцтва краіны і чаму?
9. Падрыхтуйце выступленне.

Пабудуйце кругавую дыяграму расава-этнічнага складу насельніцтва Мексікі (заданне 2 у контурнай карце на с.40)

***Картка для групы №3.*** <u>Гаспадарка. Прамысловасць</u>

Прачытаць і прааналізаваць тэкст параграфа (с. 212), дадатковы матэрыял, карты атласа (с. 89). Даць характарыстыку прамысловасці

1. Прааналізаваць структуру ВУП Мексікі і пабудаваць кругавую дыяграму.
2. Якія галіны прамысловасці базіруюцца на ўласнай сыравіне?
3. Назваць вядучыя галіны апрацоўчай прамысловасці.
4. Пералічыць прадукцыю хімічнай прамысловасці.

5. На карце паказаць буйнейшыя эканамічныя цэнтры краіны.

6. Падрыхтуйце выступленне

***Картка для групы №4.*** Сельская гаспадарка

Прачытаць тэкст падручніка на с. 213, прааналізаваць карты атласа (с.89) і даць характарыстыку сельскай гаспадарцы

1. Якая галіна сельскай гаспадаркі з’яўляецца вядучай? Чаму?
2. На чым спецыялізіруецца раслінаводства?
3. Якія сельскагаспадарчыя культуры вырошчваюць у краіне?
4. Выкарыстоўваючы матэрыял часопіса “Мир путешествий” (№ 6 2019 г.) зрабіць кароткае паведамленне “Родам з Мексікі”.

**III. Фізкультхвілінка** (Гучыць музыка марыячы)

**IV. Першаснае замацаванне ведаў і іх практычнае прымяненне.** Прэзентацыя работы кожнай групы

**Настаўнік.** У апошнія гады эканоміка Мексікі развіваецца высокімі тэмпамі. У большасці сваёй дзякуючы экспарту выробленай прадукцыі. Асноўным эканамічным партнёрам Мексікі з'яўляецца ЗША. У Злучаныя Штаты Амерыкі пастаўляецца вялікая колькасць камплектуючых для аўтамабільнай галіны ЗША. Таксама шырока развіты эканамічныя адносіны з краінамі Лацінскай Амерыкі, у прыватнасці Венесуэлай, Бразіліяй і Аргенцінай. У Азіі асноўным партнёрам з'яўляецца Японія. З краін Еўрапейскага Саюза адным з галоўных эканамічных партнёраў можна адзначыць Германію

**Група экскурсаводаў** (*апераджальнае заданне).* Выступленне суправаджаецца прэзентацыяй.

Сёння турыстычнае агенства “Вакол свету” прапануе здзейсніць падарожжа ў загадкавую, яркую, непаўторную лацінаамерыканскую краіну.

Мексіка – краіна двух акіянаў, радзіма ацтэкаў і майя, культурных раслін і велічных вулканаў.

***Прыродная разнастайнасць***

Мексіка - дзіўная краіна па разнастайнасці флоры і фаўны – ад вільготных трапічных лясоў да падводных каралавых рыфаў. Тут можна ўбачыць снежныя вяршыні гор, вадаспады, распаленыя пустыні і цудоўныя па прыгажосці даліны, атрымаць асалоду ад цудоўных краявідаў Меднага Каньёна і Каньёна-дэль-Сумідэра, убачыць тысячы яркіх матылькоў у прыродным запаведніку, наведаць магічныя сеноты Юкатана – Мексіка тоіць у сабе мноства адкрыццяў.

***Каланіяльная архітэктура***

Мехіка – самая старажытная сталіца Заходняга паўшар’я і адзін з самых вялікіх гарадоў свету. Мексіканская сталіца надзвычай багатая музеямі. У Нацыянальным антрапалагічны музеі 23 залы, якія размешчаны ў храналагічным парадку і прысвечаны розным культурам дакалумбавай Мексікі. Адным з самых прыгожых замкаў свету з’яўляецца замак Чапультэпек.

***Сляды найстаражытных цывілізацый***

Мексіка – калыска старажытных загадкавых цывілізацый.

Самыя вядомыя і значныя для гісторыі індзейскія плямёны – майя і ацтэкі.

Майя жылі на поўдні Мексікі і на поўдні паўвострава Юкатан. Іх культура налічвае звыш за 2000 гадоў. Галоўным горадам старажытных індзейцаў быў Чычен-Іца, які багаты легендамі аб багах майя. Сёння мы прапануем наведаць цудоўныя піраміды ў гэтым горадзе. Кіраўнікі таго часу будавалі іх, каб дэманстраваць сваё багацце, сваю сілу. Адна з галоўных пірамід Чычен-Іцы – Храм Кукулькана.

***Мексіка – калейдаскоп культур***

У сучасны момант на тэрыторыі Мексікі пражывае 61 племя карэнных народаў. Менавіта дзякуючы карэнным народам Мексікі, якія стараннa засцерагаюць сваю культуру, рэлігію, мову і сацыяльны ўклад, Мексіка захоўвае сваю ўнікальнасць і непаўторнасць.

Яркія нацыянальныя касцюмы мексіканцаў спалучаюць у сабе індзейскія і іспанскія традыцыі. Самбрэра папала сюды з Еўропы. Панча перайшла ў мясцовы гардэроб ад карэнных жыхароў Амерыкі.

***Нацыянальныя святы і фестывалі.*** Мексіка - краіна яркіх кантрастаў, а буйны мексіканскі тэмперамент і любоў мексіканцаў да жыцця вядомы далёка за межамі краіны.

Толькі ў Мексіцы Вам прадставіцца магчымасць адсвяткаваць смерць разам з жывымі ў *Дзень мёртвых*. Свята прыпадае на 1-е і 2-е лістапада. Многія мексіканцы вераць, што ў гэты дзень душы памерлых наведваюць зямлю і прыходзяць адведаць сваіх блізкіх. Ва ўсіх гарадах і пасёлках праходзяць жудаснаватыя святочныя шэсці – людзі прыбіраюцца ў касцюмы шкілетаў, накладваюць грым, а потым з музыкай, песнямі і танцамі адпраўляюцца на могілкі, дзе садзяцца ў магіл продкаў і балююць там да раніцы. У гэтыя дні паўсюль гараць свечкі, гаспадыні гатуюць салодкія стравы, а ад чэрапаў і костачак мітусіцца ў вачах

У 2003 годзе **ЮНЕСКА** прызнала ўнікальнасць свята ***Дзень Мёртвых*** **і** ўключыла яго ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.

***Карнавал у Веракрусе і Масатлане***

Карнавальныя шэсці ў гарадах перад каталіцкім Вялікім пастом традыцыйна лічацца самымі грандыёзнымі і маляўнічымі. Карнавал звычайна доўжыцца ад 7 да 9 дзён. Феерверкі, конкурсы, танцы, жывая музыка, касцюміраваныя прадстаўленні і цудоўная ежа чакаюць вас!

*Гелагеца* – знакаміты фальклорны фестываль, які праходзіць кожны год у ліпені. Свята сыходзіць каранямі да дакаланіяльнага перыяду, калі мясцовыя плямёны збіраліся на ўзгорку для таго, каб ушанаваць бога кукурузы Сентеотль і паднесці яму дарункі. Галагеца перакладаецца як «абмен дарамі». У выглядзе дарункаў выступае садавіна, кветкі і вырабы народнай творчасці.

***Кухня.*** Ва ўсім свеце мексіканскую кухню шануюць за экзатычнасць. Па сённяшні дзень мексіканцы выкарыстоўваюць рэцэпты старажытных майя. У 2010 годзе

традыцыйная мексіканская **кухня** была прызнана **ЮНЕСКА нематэрыяльным здабыткам чалавецтва.**

Асноўным інгрэдыентам унікальнай кухні з'яўляецца кукуруза. З кукурузнай мукі рыхтуюць мексіканскі хлеб, аладкі тартыльяс і нават дэсерты. Спелыя зерні кукурузы дадаюць у супы. І вядома, стравы запраўляюцца рознымі відамі спецый, асабліва перцам чылі, вострымі соусамі – сальсай або квакамоле. Самыя вядомыя стравы мексіканскай кухні – гэта кесадзілля, начос, суп Чылі Кон Карнэ

***Музыка.*** Адно з галоўных багаццяў Мексікі – музыка яе рэгіёнаў. Самым знакамітым жанрам з'яўляецца марыячы. Гэты жанр стаў самым любімым і папулярным у Мексіцы. Ансамблі марыячы выступаюць у тэатрах, на фестывалях, іх запрашаюць на вечарыны, у тым ліку і на дні нараджэння, яны нават выконваюць серэнады. “Калі няма марыячы – гэта не фіеста" – сведчыць мясцовая прымаўка. Быць у Мексіцы і не паслухаць мар’ячы – тое ж самае, што з’ездзіць у Парыж і не ўбачыць Эйфелефу башню.

***Беласнежныя пляжы***

Пляжныя курорты Мексікі вядомы далёка за межамі краіны і карыстаюцца папулярнасцю ў турыстаў з усяго свету. Карыбскае і ціхаакіянскае ўзбярэжжа супернічаюць паміж сабой па прыгажосці пейзажаў і крыштальнай чысціні вады. Велізарныя курортныя зоны, пяшчаныя пляжы з беласнежным пяском, раскошныя гатэлі, шумныя вечарынкі, выдатныя ўмовы для дайвінга, маса водных забаў. – усё гэта чакае вас на пляжах Мексікі.

**V. Праверка ўзроўню засваення тэмы**

*(тэст выконваецца індывідуальна)*

1.40% тэрыторыі краіны займаюць пустыні і паўпустыні:

а) так, б) не

2. Самай каштоўнай мінеральнай сыравінай краіны з’яўляецца нафта і газ:

а) так б) не

3. Для краіны характэрна гаспадарка з эканомікай:

а) постіндустрыяльнага тыпу

б) індустрыяльнага тыпу

в) індустрыяльна-аграрнага тыпу

4. Колькасць насельніцтва краіны складае

а) 130 млн чал., б) 135млн чал., в) 150 млн чал.

5. Галіна прамысловасці, якая найбольш значная для Мексікі:

а) машынабудаванне

б) нафтапераапрацоўчая і нафтахімічная

в) харчовая

6. Галоўная зернавая культура Мексікі:

а) пшаніца, б) рыс в) кукуруза

7. Асноўная частка насельніцтва краіны гэта:

а) самба б) мулаты в) метысы

8. Выбраць правільныя характарыстыкі дэмаграфічных працэсаў Мексікі:

а) высокая нараджальнасць

б) высокая смяротнасць

в) высокая доля дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў

г) высокі ўзровень урбанізацыі

9. Старажытны горад індзейцаў Чычен-Іца знаходзіцца на паўвостраве:

а) Юкатан, б) Фларыда в) Каліфорнія

10.Сталіца Мексікі, буйнейшы эканамічны цэнтр краіны - ______________

**VI. Інфармацыя аб дамашнім заданні**

**§ 49,** па жаданні скласці крыжаванку “Мексіка”.

**VII. Кантрольна-ацэначный этап**

**VIII. Рэфлексія** Прыём “Ланцужок”. Кожная група называе прыметнік (назоўнік), які характарызуе Мексіку.

**Дадатковы матэрыял**

**Родам з Мексікі**

У раслін, як і ў людзей, ёсць Радзіма. Гэта месца, дзе ўпершыню пачалі вырошчваць гэту расліну. На нашым стале вельмі шмат “выхадцаў” з Мексікі.

**Кукуруза** – ежа нумар 1 у Мексіцы. Яе ужываюць у ежу сырой, варонай, з яе робяць ляпёшкі, чыпсы. Ёсць нават кукурузнае марожанае з кавалачкамі кукурузы.

**Фасоля.** Для мексіканца есці фасолю і проста есці – словы-сінонімы (як для азіата есці рыс) У мексіканскім варыянце іспанскай мовы ёсць спецыяльнае слова фасольнічаць. Цэлыя фасоліны мексіканцы не ядуць. Спачатку іх расціраюць у спецыяльнай ступцы, а затым смажаць, вараць, тушаць. Фасоля і кукуруза ў мексіканцаў часта растуць на адным полі. Фасолі, якая ўецца, патрэбна апора, а кукуруза для гэтага ідэальны варыянт.

**Гарбуз.** Сонечны гарбуз таксама мексіканец. Індзейцы цанілі яго не толькі за смак, але і моцную кажуру. З яе рабілі ёмкасці для захавання вады.

**Перац чылі**. Мексіка без чылі – не Мексіка. У гэтай краіне яе вырошчваюць і спажываюць у ежу 6000 гадоў! Дзеці макаюць цукровыя ледзяшы ў сумесь перца з лімонам, хутка з’ядаюць і просяць яшчэ

**Сланечнік.** Для нас сланечнік – гэта смачнае насенне і алей. Індзейцы пакланяліся яму як сімвалу Сонца, лічылі свяшчэнным. Пасля таго як Калумб прывёз сонечную кветку ў Стары Свет, расліна ўпрыгожвала клумбы. Толькі напачатку 18 стагоддзя навучыліся рабіць алей.

Калі любіш шакалад – тады падзякуй за яго Мексіку! Мексіка – радзіма **какава-бабоў**. Першы шакалад з какава-бабоў прыгатавалі майя. Ён быў вадкі і гарачы. Яго робяць на гарачай вадзе з дробкай перцу чылі. Цукар і малако ў шакалад сталі дадаваць еўрапейцы.


MEKCIKA

# Грашовая адзінка - мексіканскі песо
















С Ш А
Мехикали
Американский барсук
Сьюдад-Хуарес
П-ОВ КАЛИФОРНИЯ
Эрмосильо
Чиуауа
Чихуахуа
Пиво "Sol"
Монтеррей
Морской слон
Кульякан
Голубая агава
Атлант из Тулы
Бабочка-зебра
Масатлан
Текила
Меч-рыба
Пуэрто Вайарта
Теотиуакан
Гвадалахара
о-ва Ревилья-Хихедо
Мансанильо
Колима
МЕХИКО
Вулкан Попокатепетль (5452 м)
Таско
Иштапа
Акапулько
Оахака
Коацакоалькос
Веракрус
Тампико
ЗАЛИВ КАМПЕЧЕ
МЕКСИКАНСКИЙ ЗАЛИВ
о.Перес
КУБА
Мерида
Чичен Ица
о.Женщин
Канкун
о.Косумел
п-ов Юкатан
КАРИБСКОЕ МОРЕ
БЕЛИЗ
ГОНДУРАС
ГВАТЕМАЛА
САЛЬВАДОР
НИКАРАГУА
ТИХИЙ ОКЕАН
www.milletour.ru Миль Тур














# Медны каньён










# МЕХІКА





Храм Базіліка
Божай Маці Гвадэлупскай



Цэнтральны кафедральны
сабор

# Замак Чапультэпек





# Нацыянальны антрапалагічны музей







# Старажытны горад
# Чычэн-Іца










# Нацыянальнае адзенне









# Мексіка- краіна карнавалаў





# Самая вядомае свята – Дзень мёртвых










PUMAS









# Гелагеца

# Мексіканская кухня




тортилья


кесадилья


начос
Едим Дома
www.edimdoma.ru


Суп Чилли Кон Карне

# Марыячы








# Мексіка –краіна двух акіянаў








CANCÚN



Мексіка чакае вас!